# ПАРАДАК У АГУЛЬНЫМ ДОМЕ

## Тысячы людзей працавалі на суботніку ва ўсіх рэгіёнах краіны

Зранку працоўны дэсант кіраўніцтва **Брэсцкага** аблвыканкама накіраваўся на будаўнічую пляцоўку медыцынскага комплексу ў Заручным мікрараёне абласнога цэнтра. Там, дзе размесцяцца дарослая і дзіцячая паліклінікі на 500 і 600 наведванняў у змену адпаведна, а таксама жаночая кансультацыя на 190 прыёмаў у дзень, будаўнічыя работы ўступаюць у завяршальную стадыю. Увод у строй аб'екта чакаецца ў снежні, таму дапамога яшчэ адной брыгады аказалася дарэчы.

— Грошы, якія зарабілі на суботніку, пойдуць на добраўпарадкаванне помнікаў, астатнія — на барацьбу з пандэміяй, — заўважыў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

Тым часам прадстаўнікі гарвыканкама на чале са **старшынёй Аляксандрам РАГАЧУКОМ** шчыравалі на добраўпарадкаванні вуліцы Зубачова ў раёне Брэсцкай крэпасці, а таксама ў парку Тысячагоддзя.

Не застаўся без увагі гарадской вертыкалі і сквер па вуліцы Валгаградскай.

У Баранавічах асноўныя работы па добраўпарадкаванні прайшлі ў гэты дзень у Парку культуры і адпачынку. У Пінску працавалі на набярэжнай ракі Піна. Работнікі Бярозаўскага райвыканкама, акрамя іншых аб'ектаў, прыводзілі ў парадак Вайцяшынскую сельскую бібліятэку. Моладзь Іванаўскага раёна праявіла ініцыятыву па расчыстцы меліярацыйнага канала па вуліцы Будаўнікоў у Іванаве.

Да мемарыяльнага комплексу партызанскай славы ва ўрочышчы «Хаваншчына» прыехалі з Івацэвіцкага райвыканкама. Пасля навядзення парадку ўдзельнікі суботніка ўшанавалі памяць герояў вайны. А кіраўніцтва Кобрынскага раёна шчыравала на ферме «Рыбна» ААТ «Кісялёўцы». Вялікі дэсант з райцэнтра працаваў на тэрыторыі гістарычнага аб'екта — былой сядзібы Рэйтанаў у вёсцы Грушаўка Ляхавіцкага раёна.

* * *

Жыхары **Віцебшчыны** дружна займаліся добраўпарадкаваннем на тэрыторыі мемарыялаў: «Прарыў» — ва Ушацкім раёне, «Урочышча Пяскі» — у Полацкім, «Вішанькі» — у Чашніцкім, воінскім пахаванні ў аграгарадку Копці Віцебскага раёна і іншых.

Кіраўнікі абласной вертыкалі высадзілі дрэвы тэрыторыі вытворчых прадпрыемстваў, высаджвалі дрэвы. Так, у Гомелі супрацоўнікі абласнога аб'яднання прафсаюзаў высадзілі алею з 60 клёнаў.

Калектыў галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама выступіў з ініцыятывай добраўпарадкаваць тэрыторыю панскай сядзібы ў вёсцы Хальч Веткаўскага раёна. Ачысцілі тэрыторыю помніка архітэктуры ад раслiннага смецця, склалі дровы, нарыхтаваныя для ацяплення.

На Брагіншчыне жыхары раёна актыўна наводзілі парадак на вуліцах: ачышчалі тратуары і абочыны, фарбавалі агароджы. У райцэнтры да правядзення рэспубліканскага суботніка прымеркавалі закладку новай алеі ў скверы памяці ахвяр катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Жыхары Мазыршчыны правялі суботнік на дваровых тэрыторыях маладых мікрараёнаў актыўнай жыллёвай забудовы. Сімвалічна, што ў гэты дзень ў сем'і мазыран прыйшла важная навіна: у адным з маладых мікрараёнаў райцэнтра свае дзверы расчыніў новы яслі-сад на 330 месцаў. **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ,** які браў удзел у адкрыцці сацыяльна значнага аб'екта, далучыўся да закладкі алеі «Планета дзяцінства» на тэрыторыі новай дашкольнай установы.

* * *

Адной з асноўных пляцовак рэспубліканскага суботніка ў **Магілёве** стала тэрыторыя фізкультурна-спартыўнага комплексу на вуліцы Фаціна. Па даручэнні Прэзідэнта гэты аб'ект атрымаў стабільнае фінансаванне і яго будаўніцтва вядзецца апераджальнымі тэмпамі.

— Жыхары Магілёўскай вобласці вельмі актыўна адгукнуліся на заклік ударна папрацаваць, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — На суботнік выйшлі тысячы людзей. Пэўная частка сродкаў будзе накіравана на добраўпарадкаванне мемарыяльнага комплексу «Усакіна» ў Клічаўскім раёне. Суботнік яскрава паказвае, што мы моцныя ў сяброўстве і непераможныя ў справах.

У пасадцы маладых дрэўцаў прымаў удзел **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід МАРТЫНЮК.**

— Любая праца, і тым больш такая, якая прыносіць задавальненне і карысць, радуе, — адзначыў ён. — Калі чалавек нешта робіць сваімі рукамі, ён гэта больш цэніць.

Наводзіць прыгажосць на прылеглай тэрыторыі фізкультурна-спартыўнага комплексу дапамагалі дэпутаты аблсавета і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь: Ірына Раінчык, Ігар Марзалюк і Вольга Петрашова.

— Традыцыйна прымаем удзел разам з органамі мясцовага самакіравання, — адзначыла **намеснік старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.** — Мы саджаем дрэвы, наводзім парадак на дваровых тэрыторыях, воінскіх пахаваннях. Робім усё дзеля таго, каб Прыдняпроўскі край стаў яшчэ больш прыгожы.

* * *

Ва ўсіх раёнах **Мінскай вобласці** і горадзе Жодзіне прайшлі суботнікі, у якіх прынялі ўдзел людзі розных узростаў і прафесій: студэнты, школьнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, прамысловых прадпрыемстваў, мясцовых улад.

Супрацоўнікі Мінаблвыканкама на чале з яго **старшынёй Аляксандрам ТУРЧЫНЫМ** падчас рэспубліканскага суботніка працавалі ў Бярэзінскім раёне, дзе добраўпарадкоўвалі тэрыторыю каля помніка чырвонаармейцам. Менавіта тут, на беразе ракі Бярэзіны, непадалёку ад вёскі Міраслаўка, у 1941 годзе, на самым пачатку вайны, трынаццаць воінаў прынялі на сябе ўдар нямецкіх захопнікаў.

Аляксандр Турчын падкрэсліў, што нашчадкі павінны памятаць аб трагічных падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Хоць гэты абеліск знаходзіцца далёка ад бойкіх дарог, а людзі прыходзяць сюды нячаста, каб ускласці кветкі, кожны з помнікаў павінен быць дагледжаны.

Дэпутаты Мінскага абласнога Савета, а таксама Смалявіцкага раёна разам са **старшынёй аблсавета Наталляй ЯКУБІЦКАЙ** добраўпарадкавалі тэрыторыю каля помніка ў вёсцы Прылепы Смалявіцкага раёна. Ён быў устаноўлены ў гонар 60 байцоў і 245 жыхароў вёсак на тэрыторыі калгаса імя У. І. Леніна, якія загінулі падчас вайны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

(ліпы, бэз, каштаны) на віцебскай вуліцы Гагарына, дзе вядзецца маштабная рэканструкцыя. На жаль, гэты дарожны аб'ект стаў даўгабудам, бо работы тут пачаліся ў 2005 годзе. **Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** на суботніку агучыў даручэнне наладзіць рэканструкцыю ў тры змены. Здача ў эксплуатацыю фактычна будучага праспекта — ліпень.

* * *

**Гродзенскія** ўлады ўнеслі сваю працоўную лепту па добраўпарадкаванні і будаўніцтве анкадыспансера, які будуецца ў Гродне. Гэта самая маштабная медыцынская будоўля ў вобласці.

Дарэчы, першая чарга дыспансера ў складзе радыелагічнага корпуса і ўсіх неабходных аб'ектаў інфраструктуры будзе ўведзена ў эксплуатацыю ўжо сёлета. Завяршыць будаўніцтва плануецца ў 2025 годзе. **Старшыя Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК** пастаянна трымае гэты аб'ект на кантролі і падчас суботніка разам з абласнымі чыноўнікамі прыняў удзел у будаўнічых работах.

Падчас суботніка **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** займаўся навядзеннем парадку на мемарыяльным комплексе ў Гродне. А вось прадстаўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама на чале з выконваючым абавязкі начальніка Аляксандрам Шастайлам сваю працоўную вахту правялі на пасадцы лесу. Таксама супрацоўнікі УУС аднавілі помнік загінулым міліцыянерам і мемарыяльную дошку.

* * *

На **Гомельшчыне** падчас рэспубліканскага суботніка працоўныя дэсанты добраўпарадкоўвалі вуліцы гарадоў, пасёлкаў і вёсак, наводзілі парадак у парках і скверах, высякалі хмызнякі, прыбіралі